# Першадрукар Беларусі



Беларус Францыск Скарына быў першым кнігадрукаром ва ўсходніх славян у перыяд з 1517 па 1533 гады



# Кнігі Францыска-палачаніна ў народзе чыталіся і паважаліся

І падпісваўся першадрукар з гонарам: «Русін з Полацка»



# Перакладчык, рэдактар, тлумач і выдавец «Библии рускай»

Мова, на якой Францыск Скарына друкаваў свае кнігі, была заснавана на царкоўнаславянскай мове, але з вялікай колькасцю беларускіх слоў



У 1517 годзе Скарына засноўвае ў Празе друкарню і выдае кірылічным шрыфтам «Псалтыр», першую друкаваную беларускую кнігу Біблііі



Усяго за два гады (1517-1519) знаходжання ў сталіцы Чэхіі Праза Скарына перакладае і выдае 23 кнігі: Псалтыр і 22 кнігі Старога Запавету агульным аб'ёмам звыш 1200 друкаваных аркушоў



У 1520 годзе Францыск пераязджае ў Вільню і засноўвае першую друкарню на яе тэрыторыі. У ёй Скарына выдае «Малую падарожную кніжку» (1522 год) і «Апостал» (1525 год)



Скарына нашмат апярэдзіў сваю эпоху, духоўны патэнцыял яго спадчыны разлічаны не на адно стагоддзе. Першадрукар зрабіў найкаштоўнейшы ўнёсак у развіццё славянскага пісьменства і культуры



Палымяны прапагандыст агульнаславянскіх духоўных каштоўнасцяў, Скарына стаў яркім увасабленнем культурнага самасцвярджэння сярэднявечнага беларуса



“Францыск, сын Скарынін з слаўнага града Полацка, у навуках вызваленых і лекарскіх доктар”, як ен сам падпісваў кнігі, - заснавальнік усходнеславянскага кнігадрукавання, філосаф і гуманіст-асветнік, навуковец і пісьменнік, перакладчык і мастак, тытан духу і няўрымслівы падарожнік…



# Вобраз першадрукара ў культурнай прасторы Беларусі













# Вывучэнне спадчыны Ф. Скарыны












# Вобраз Скарыны ў беларускім жывапісе









# Вобраз Скарыны ў беларускай графіцы








# Скульптурныя ўвасабленні вобразу першадрукара










# Мемарыяльныя шыльды як пазначэнне культурнай прасторы









